Г. І. БАСАВА

# НЕКАТОРЫЯ АСАБЛІВАСЦІ УЖЫВАННЯ АКАЗІЯНАЛЬНЫХ СЛОЎ У МАСТАЦКІХ ТЭКСТАХ

Аказіянальныя словы маюць цэлы рад характэрных рыс, сярод якіх найбольш важнай для мастацкіх тэкстаў з'яўляецца экспрэсіўнасць, гэта значыць стылістычная адзначанасць у шырокім сэнсе. Ступень экспрэсіўнасці аказіянальнага слова залежыць не толькі ад яго незвычайнасці, але і ад адпаведнасці тым эстэтычным функцыям, якія яно павінна перадаць у тэксце. Найбольш распаўсюджанымі прыёмамі аказіянальнага словаўжывання з'яўляюцца наступныя:

I. Аб'яднанне ў адным кантэксце рознакарэнных узуальных і аказіянальных слоў, якія змяшчаюць адзін і той жа словаўтваральны элемент: а) выкарыстанне ўтварэнняў з суфіксамі суб'ектыўнай ацэнкі. Гэты прыём можа ўзмацняцца шляхам далучэння суфіксаў суб'ектыўнай ацэнкі да асноў, якія звычайна не спалучаюцца з імі. Параўн. сутыкненне рознакарэнных назоўнікаў з суфіксам *-інк(а)* (*ліліпуцінкі* — узуальнага і *гулівершынкі* — аказіянальнага) (У. Шаўчэнка); б) паралельнае словаўжыванне рознакарэнных аказіянальных і ўзуальных назоўнікаў і дзеясловаў, якія маюць агульны прэфікс, з мэтай падкрэсліць агульны элемент у іх значэнні: *антыпара, антыкварты, антытвар* і *антыквар* (Р. Барадулін); *адмаяваць, адлетаваць* і *адлётаць* (Я. Янішчыц); в) агульным элементам, які паўтараецца ў аказіянальных і ўзуальных словах, можа быць і адна з частак складанага слова: *лістапад, зарапад* і *землялад* (А. Разанаў).

II. «Сумяшчэнні» ў адным кантэксце аднакарэнных узуальных і аказіянальных слоў, якія змяшчаюць розныя словаўтваральныя марфемы: а) аб'яднанне аднакарэнных назоўнікаў з суфіксамі суб'ектыўнай ацэнкі: *лунатка* і *лунацік* (Р. Барадулін), *вершаняты* і *вершанё* (Н. Гілевіч), *тузы* і *тузяняты* (П. Панчанка); б) змяшчэнне ў адзін кантэкст аказіянальных дзеясловаў з матывуючай асновай узуальнага назоўніка: *гарбуз — гарбузаваць* (Г. Пашкоў), *бедуінка — забедуініць* (П. Панчанка), *чарка — адчаркавацца* (М. Чарняўскі); в) аб'яднанне ў тэксце рада слоў розных часцін мовы з адной і той жа каранёвай марфемай: *баравік — баравінны — баравінятнкі* (Г. Пашкоў); *аса асаецца, куса кусаецца* (Р. Барадулін).

III. Аб'яднанне ў адным кантэксце ўзуальных і аказіянальных слоў, створаных па адной словаўтваральнай мадэлі: *смяшынка, хітрынка* і *саромінка* (А. Вярцінскі); *азёрна, борна і гойна* (Р. Барадулін); *зорна* і *азонна* (М. Стрыгалёў); *самотна* і *адзінотна* (Н. Мацяш).

IV. Выкарыстоўваюцца аказіяналізмы — складаныя назоўнікі, адзін кампанент якіх узяты з якой-небудзь распаўсюджанай назвы, а другі з'яўляецца нечаканым, што надае навізну ўсяму ўтварэнню: *хлопцанарыхтоўка* (М. Лужанін) (параўн. узуальныя словы *збожжанарыхтоўка, лесанарыхтоўка*); *загканата, загцёшчаблін, начсалома* (К. Кірэенка) (параўн. *загадчык аддзела, начальнік заставы*).

Такім чынам, сярод выяўленых сродкаў, якія выкарыстоўваюцца ў мастацкай літаратуры пры стварэнні аказіянальных слоў, значнае месца належыць і такім, якія заснаваны на актуалізацыі словаўтваральнай структуры слова. Гэтыя сродкі і прыёмы падкрэсліваюць эстэтычную накіраванасць мовы мастацкай літаратуры, ствараюць адчуванне ўнутранай формы слова.